*Гарадская цэнтралізавная бібліятэчная сістэма г.Гродна;*
*Аддзел бібліятэчнага маркетынгу*
*ГЦБ імя А.Макаёнка*

# у біяграфію паэта

# Сучкова
# Таццяна
# Аркадзьеўна

*Гродна, 2005*



Сучкова Таццяна Аркадзьеўна, 1956 года нараджэння, адукацыя вышэйшая, працуе ў галіне культуры г.Гродна – ў гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме з 1993 года, з 1996 года – бібліятэкар філіяла №6.

Нарадзілася ў вёсцы Губачава Кіняшэмскага раёна Іванаўскай вобласці Расіі. З 1971 года жыве ў горадзе Гродна. У 1979 годзе скончыла філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Атрымала спецыяльнасць настаўніка рускай мовы і літаратуры.

Сучкова Т.А. са школьнага ўзросту пачала плённа займацца літаратурнай працай. Друкавалася ў рэспубліканскіх і абласных газетах і часопісах, калектыўных зборніках. Аўтар шматлікіх вершаў, на якія напісана музыка.

Першая публікацыя верша Таццяны Сучковай, на той час вучаніцы СШ №3 г.Гродна, была ў газеце “Гродзенская праўда”. Цяжка пералічыць на сённяшні дзень колькасць вершаў, якія друкаваліся і друкуюцца ў газетах “Гродзенская праўда”, “Аркуш”, у рэспубліканскіх выданнях – часопісах “Вясёлка”, “Пралеска”, “Пачатковая школа”, “Гаспадыня”, “Качели”, газетах “Сям’я”, “Зорька”.

Кніжнае выданне яе твораў адбылося ў 1996 годзе, калі ў выдавецтве “Юнацтва” выйшаў калектыўны зборнік твораў для дзяцей “Петя Зяблик и его кораблик”, значны раздзел якога над назвай “Что за дерево такое?” змяшчаў вершы Сучковай Т.А.

Спрабавала Таццяна Сучкова пісаць дзіцячыя творы ў прозе. Невялікія казкі рэгулярна ў пачатку 90-х гадоў з’яўляліся ў газеце “Сельская навіна”. Казкі для дзяцей у перакладзе на польскую мову друкаваліся ў газеце “Glos znad Niemna” у 1997 годзе і вельмі спадабаліся чытачам газеты.

Апошнім часам Таццяна Сучкова пачала пісаць цудоўныя вершы і на беларускай мове. Вершы яе на беларускай мове апублікаваны ў штогадовіках “Галасы” за 2002 і 2003 гады, укладальнік якіх знакміты паэт Юрка Голуб вельмі высока ацэньвае творы паэтэсы і з задавальненнем заўсёды садзейнічае змяшчэнню іх на старонках “Гродзенскай праўды”.

Літаратурна-мастацкія альманахі “Нябесны знак” за 2001, 2003 і 2004 гады, укладальнікам якіх з’яўляецца паэтэса Марыя Шаўчонак, змяшчаюць таксама цікавыя і яркія вершы Сучковай Т.А. для дзяцей на беларускай мове.

Т.А.Сучкова з лёгкасцю выйграла літаратурны конкурс на лепшыя частушкі, аб’яўлены ў 2002 годзе часопісам “Гаспадыня”, атрымала дыплом пераможцы літаратурнага конкурсу на лепшы твор аб родным горадзе “Гэта мой горад”, аб’яўленага да святкавання 875-годдзя нараджэння Гродна ў 2003 годзе.

Т.А.Сучкова ў асноўным піша паэтычныя творы для дзяцей на рускай і беларускай мовах. Яны вызначаюцца асаблівай вобразнасцю, лёгкасцю і меладычнасцю. Яе вершы цудоўна гучаць, як музычныя творы. Гэта заўважылі знакамітыя беларускія кампазітары і паэты.

На працягу пятнаццаці гадоў Таццяна Аркадзьеўна падтрымлівае цеплыя сяброўскія адносіны з паэтам У.Карызнай, які заўсёды прывячаў яе творчыя задумкі. Менавіта У.Карызна пазнаёміў Таццяну Сучкову з вядомым беларускім кампазітарам Леанідам Захлеўным, з якім у паэтэсы завязалася плённае творчае супрацоўніцтва. Напісаныя Л.Захлеўным песні на яе вершы неаднаразова гучалі па радыё і тэлебачанні ў выкананні ансамбля “Бяседа” і яго салісткі, заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Святланы Суседчык.

Музычныя творы на вершы паэтэсы пакаралі не толькі беларускіх слухачоў, але і выконваліся на замежных сцэнах. Па выказваннях кампазітараў і выканаўцаў яе твораў, сярод якіх і вядомая спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Надзея Мікуліч, яе вершы маюць асаблівы лірызм і закранаюць душу.

Адбылося таксама творчае супрацоўніцтва паэтэсы Сучковай Т.А. з папулярным беларускім кампазітарам Паўлам Яроменка. Сумесна была напісана песня “Суседка” для выканаўцы Надзеі Мікуліч.

Песні на яе вершы пісалі ў Гродна кампазітары Маркелаў А.Я. і Коп М.А. У Мінску у 2000 годзе выдадзены зборнік песен А.Маркелава на вершы Сучковай Т.А. пад назвай “Сур’ёзная размова”.

Дзіцячыя песні “Аб вясне” і “Цуды” на вершы Сучковай Т.А. змешчаны ў падручніках па музыцы для 3-га і 6-га класаў сярэдніх школ. Вучні многіх сярэдніх школ горада Гродна з задавальненнем развучваюць песні на яе вершы. Музычныя кіраўнікі школ часта выкарыстоўваюць для гэтага ноты з асабістага архіву паэтэсы, так як агульнага зборніка дзіцячых песень на вершы Т.А.Сучковай пакуль няма.

Таццяна Аркадзьеўна адгукаецца заўсёды на шматлікія просьбы напісаць гімны арганізацыям, установам і прадпрыемствам горада Гродна, стварыць песню ці верш, прысвечаныя мясцінам ці невялікім гарадам Гродзеншчыны. Гімн на яе верш, напрыклад, выконваюць нашы знакамітыя Гродзенскія спартсмены па грэка-рымскай барацьбе. Існуюць цудоўныя вершы для стаматолагаў, настаўнікаў, паэзія аб бібліятэчнай дзейнасці і бібліятэкарах, маляўнічыя вершы аб гарадах Скідзель і Азёры, аб вёсцы Квасоўка.

Сучкова Таццяна Аркадзеўна - таленавітая і шматгранная паэтэса, творчасць якой чакае і заслугоўвае свайго выдання ў выглядзе асобнага зборніка. Значная кніжка для дзяцей магла б выйсці з вялікага назапашанага паэтычнага матэрыялу, асобныя вершы з якога да гэтага часу друкаваліся ў розных перыядычных выданнях.

Яе паэтычныя здольнасці, таленавітая літаратурная праца садзейнічаюць эстэтычнаму выхаванню і развіццю творчасці дзяцей у бібліятэцы. Таццяна Аркадзеўна добра ведае дзіцячую псіхалогію, паспяхова арганізоўвае міжасабовыя зносіны і вольны час маленькіх чытачоў. Яна – часты госць мерапрыемстваў для дзяцей, якія праводзяць супрацоўнікі бібліятэк горада.

Сучкова Таццяна Аркадзьеўна - сумленны і добразычлівы чалавек. Яна бескарысліва дарыць нам свой паэтычны талент. Няхай творчае натхненне не здрадзіць ёй у жыцці, а ад літаратурнай працы і заслужанага поспеху яна атрымлівае не толькі радасць і асалоду, але і матэрыяльны дабрабыт.

*Матэрыял*
*падрыхтавала*
*Свірыда Н.Р.*



Таццяна СУЧКОВА

## Месяц

*Над пясчаным бродам*
*Бераг пахне мёдам.*
*Месяц у раку нырае,*
*Быццам рыбка залата*
*Ціха ноччу весяліцца*
*У сярэбранай вадзіцы.*

Верш Т.Сучковай, надрукаваны ў часопісе “Вясёлка” [2001 год, №5]

**Стихи для детей**

Татьяна Сучкова

### Хомячок

Золотистый хомячок,
Как пузатый кабачок,
Он прогрыз дыру в мешочке:
От зерна распухли щечки.

### Капелька

Дождевая капелька
На стебельке висит.
Маленькое солнышко
В капельке блестит.

### Во дворе

На кустах воробушки
Дружно чистят перышки.
Облизнулись кошки:
- Спускайтесь на дорожку.
На земле играть давайте?!
- Лучше с нами полетайте!

### Бурундук

Бурундук, бурундучок,
Что ж ты спрятал в сундучок?
- Золотые зернышки,
В них кусочки солнышка.

*Галасы 2003*

### РАМОНКАВАЕ ЛЕТА

Рамонкавае лета залатое,
З травы рамонак сонейкам глядзіць,
А сонца, нібы кветка над зямлёю,
У небе ранкам промнямі звініць.
І конік весяліцца і стракоча,
І з кветкі п'е мядовую расу,
Ён змайстраваць хутчэй арэлі хоча,
Каб на травінцы калыхаць асу.
А матылька на лузе сустракае
Рамонкаў жаўтавокіх карагод,
Як парашут, ён весела лятае
І кліча ўсіх да сонейка ў палёт.

### СПЁКА

На двары такая спёка,
Ходзіць качка адзінока,
Кліча пеўніка гуляць,
Каб у рэчцы панырацць.
Пеўнік узмахнуў крылом
І схаваўся пад кустом:
— Лепей, качка, у цяньку
Паляжу я на баку,
У нябёсы пагляджу,
Дачакаюся дажджу.

Вершы, надрукаваныя ў газеце “Гродзенская праўда” і
вершы са зборніка “Галасы” [Уклад. Ю.Голуб.-Гродна, 2003г.]



# КАЧЕЛИ

Музыка *Леонида Захлевного*
Слова *Татьяны Сучковой*

Во дворе шумят берёзы,
Ветер треплет их за косы,
От меня ушёл к подружке
Рыжий мальчик мой в веснушках.
Во дворе у нас качели
Вечерами звонко пели,
К облакам с тобой летели
На воздушных парусах.

*Припев:*

Ах, качели, качели -
Оглянуться не успели,
Детства нашего причал
Нам платочком помахал. *2 раза*

Подросли девчонки наши,
И мальчишки стали старше,
И растаял день вчерашний
В белоснежных облаках.
Ты несёшь портфель подружке,
Что-то шепчешь ей на ушко,
Взглядом вас я провожаю
И качели вспоминаю.

*Припев.*

Часопіс “Качели” [ 2001, №4] з песняй на верш Т.Сучковай




Тытульны ліст са зборніка “Петя Зяблик и его кораблик”
[ “Юнацтва, 1986 год]

Татьяна СУЧКОВА

*Стихи для детей*

## Розовые дни

Весна пошлет в подарок
Нам розовые дни
И птиц веселых пары
В просторах вышины.
Подснежники, подснежники
На платье у весны,
А в розовом орешнике
Мелодии слышны,
И розовое солнце,
Как роза, надо мной,

Так радостно поется
Мне розовой весной.
В лучах расцвел подснежник,
В лучах блестит ручей,
И розовый орешник
От розовых лучей.
Сосна-свеча от солнца
Вся в розовом огне,
А ручеек смеется
И дарит песню мне.



На адном з мерапрыемстваў у бібліятэцы
Т.А.Сучкова не толькі ў ролі чытальніка сваіх вершаў,
але і ўважлівага слухача (2005год)



На сцэне Гродзенскай філармоніі Т.А.Сучкова
выступае з вершамі ў гонар свята дзіцячай і юнацкай кнігі (2001г.)

*Дарагая Таццяна Аркадзьеўна!*
*Сардэчна віншуем Вас з Юбілеем!*
*Жадаем Вам, нашаму нястомнаму паэту і абаяльнай жанчыне, моцнага здароўя і выключна спрыяльных умоў для развіцця ўсіх ініцыятыў і пачынанняў!*

*Няхай Ваша жыццё будзе поўным цікавых сустрэч і прыемных падарункаў, а кожны наступны дзень Ваш будзе падобным на свята.*
*Няхай у вокны Вашага дома і бібліятэкі заўсёды свеціць сонца, у справах спадарожнічае ўдача, у асабістым жыцці будзе згода і каханне, а кожны новы дзень дорыць новую радасць!*

Калектыў Гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы

г.Гродна
4 студзеня 2006